# СЛОВА – ПІСЬМЕННІКАМ-ЗЕМЛЯКАМ. ЛЮДМІЛА КЕБІЧ

**17 красавіка з вучнямі Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 38 імя Кірылы Тураўскага г. Гродна» сустрэлася старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, паэтэса, празаік, перакладчык Людміла Антонаўна КЕБІЧ. Асобнай старонкай мерапрыемства стала тэма 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Яна заўсёды розная. Сустрэчы з гэтай пісьменніцай праходзяць, як цікавая, карысная гутарка з мудрацом, з даўнім і верным сябрам. Таму што ў яе слове гучыць народная мудрасць і каларытна, маляўніча адлюстроўваецца ў дэталях сучасных рэалій. Яе паэзія – голас нашых нацыянальных вытокаў, які гучыць з пачуццём шчырай любові да чалавека і роднай зямлі. Яе мова празрыстая, як крынічная вада, закалыхвае людскія трывогі і абуджае ў сэрцах усёпераможнае цяпло дабрыні.



Людміла Антонаўна – ганаровы, жаданы госць у кожнай установе ці то культуры, ці адукацыі. Усё жыццё аддала нялёгкай працы педагога. Зараз працуе з «дарослымі дзецьмі», як вобразна можна назваць пісьменнікаў. Умее знаходзіць агульную мову з усімі, індывідуальны падыход арганічна спалучае з універсальным багатым вопытам псіхолага, філосафа, дыпламата, стратэга. Валявы кіраўнік, чулы майстар сваёй

справы, прагрэсіўна думаючы мастак. Гэтыя эпітэты і характарыстыкі па праву прагучалі ў яе адрас на розных этапах прафесійнага і творчага шляху. І працягваюць гучаць. Выступленні Людмілы Антонаўны ўспрымаюцца на адным дыханні. У фінале такіх сустрэч многія імкнуцца наблізіцца да яе, хочуць яе абняць або хаця б толькі да яе дакрануцца… Слухачы максімальна пагружаюцца ў атмасферу яе паэтычнага царства і ў хуткім часе пачынаюць адчуваць сябе яго паўнапраўнымі жыхарамі. Розныя часы, розныя тэмы, вобразы, розныя аўдыторыі… І заўсёды розная яна сама, такая непасрэдная і непаўторная – сучасная беларуская паэтэса Людміла Кебіч.











Людміла Антонаўна распавяла пра дзейнасць Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, якое сёлета адзначыць 20-годдзе свайго ўтварэння; зрабіла прэзентацыі некалькіх сваіх персанальных выданняў, пачытала ўласныя вершы розных гадоў, адказала на пытанні зацікаўленай моладзевай аўдыторыі. Пасля сустрэчы на памяць засталіся кнігі з аўтарскім аўтографам. А яшчэ ўражанні, пачуцці, фотаздымкі… Застаўся смак. Смак сапраўднага мастацтва і доўгага жыцця ў ім. Адчуванне чагосьці блізкага і вельмі дарагога, што ўсіх нас падсілкоўвае жыццёвай энергіяй і добрым настроем – такі ён, эфект ад сустрэчы з гэтай творцай.

Паэтэса правяла два ўрокі для адзінаццатых класаў. У госці была магчымасць прачытаць пра сябе на старонках падручніка, па якім у беларускіх школах вывучаюць сённяшні дзень айчыннай літаратуры. Асобнай старонкай мерапрыемства стала тэма 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Менавіта ёй прысвечаны зборнік літаратурна-мастацкіх твораў да 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Памяці вечны агонь»; яго ваенна-патрыятычны змест калектыў аўтараў актуалізуе і напярэдадні 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Людміла Антонаўна здзейсніла прэзентацыю гэтай унікальнай кнігі. Цяпер зборнік атрымаў прапіску ў 38-й школе.

Ініцыятарам сустрэчы выступіла даўняя і добрая знаёмая гродзенскіх пісьменнікаў, настаўніца беларускай мовы і літаратуры СШ № 38 Жанна Антонаўна Івашкевіч. Мэты цыклу сустрэч школьнікаў з сучаснымі пісьменнікамі – папулярызацыя творчага ладу жыцця і літаратурнага жыцця Прынёманскага краю; пашырэнне кругагляду моладзі; набыццё каштоўных ведаў, неабмежаваных рамкамі школьнай праграмы.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, паэтэса, празаік, перакладчык Людміла Антонаўна КЕБІЧ у гасцях у адзінаццацікласнікаў Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 38 імя Кірылы Тураўскага г. Гродна». 17 красавіка 2025 года.









ШКОЛА

www.pisateli.by